*8.* Мельнік Ульяна Кірылаўна, 1923 г. н., в. Чамярын, Пінскі р-н. Зап. А. Смалянчук, Г. Энгелькінг у 2011 г. // Беларускі архіў вуснай гісторыі (БАВГ). 21–356–915, 1124, 1125; 44–356–2706-2710. 04:00:53.

*9.* Найлепшы бок : фотаальбом. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – 152 с.

*10. Саўчанка, Н.* Сава Сіўко (1888–1978) – фатограф Любчанскага краю / Н. Саўчанка : Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь. – Мінск : Альтиора Форте, 2019. – 312 с.

*11. Смирнова, И. Ю.* Настенные фотоальбомы Неглюбки. Сельский фотограф Ф. И. Ковалев / И. Ю. Смирнова // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. Вып. 3 / гал. рэд. А. І. Лакотка ; Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2022. – С. 527–531.

*12. Таранда, Н.* Петр Таранда. Архив провинциального фотографа [Электронный ресурс] / Н. Таранда. – Режим доступа: https://znyata.com/photo/247-petr-taranda.html. – Дата доступа: 10.06.2022.

*13.* Ян Комар – фотограф из Няньково [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://iankomar.tilda.ws/. – Дата доступа: 10.06.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 398.332.416:572.08(476.7)

**І. В. Хамутова,**
*магістр культуралогіі, аспірант,*
*выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# СРОДКІ І МЕТАДЫ ВІЗУАЛЬНАЙ АНТРАПАЛОГІІ Ў ДАСЛЕДАВАННІ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ КАЛЯДНАЙ АБРАДНАСЦІ

Выкарыстанне сродкаў і метадаў візуальнай антрапалогіі пры вывучэнні заходнепалескай каляднай абраднасці, як і ўвогуле нематэрыяльнай культурнай спадчыны, не губляе сваёй актуальнасці, а з цягам часу толькі ўдасканальваецца. Так, калі раней асноўным сродкам фіксацыі была замалёўка, то з тэхнічным прагрэсам важнымі сродкамі фіксацыі сталі з’яўляцца фота- і відэазапісы, а таксама аўдыязапісы. Звяртаючыся да вывучэння культуры Заходняга Палесся, трэба адзначыць, што цікавасць да культуры дадзенага этнаграфічнага

рэгіёна пачалася даволі рана. Асобна неабходна выдзяліць уклад у захаванне мясцовай культурнай спадчыны Я. Н. Драздовіча і яго замалёўкі – «Беларус-паляшук», «Кабета ў палескім строі», «Палеская хата», «Стажкі ў вёсцы Дубранавічы на Піншчыне»; Д. Т. Паланткевіча, Г. Паддэбскага і іншых фатографаў-аматараў пачатку XX ст.; З. Я. Мажэйкі і яе этнаграфічны фільм «Палескія калядкі». З цягам часу дадзеныя працы не губляюць сваю актуальнасць, а з'яўляюцца падмуркам для сучасных даследчыкаў, даюць магчымасць выявіць трансфармацыю мясцовых культурных асаблівасцей.

**Ключавыя словы:** культурная антрапалогія, візуальная антрапалогія, аўдыявізуальная фальклярыстыка, Заходняе Палессе, калядная абраднасць, этнаграфічны фільм, відэафіксацыя.

**I. V. Hamutova,**
*Master of Cultural Studies, postgraduate student, lecturer of the Department of Folksong Art and Folklore of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

## MEANS AND METHODS OF VISUAL ANTHROPOLOGY IN THE STUDY OF THE WEST PALIESSIE CAROLING RITUALS

The application of the means and methods of visual anthropology in the study of the West Paliessie caroling rituals, as well as in that of the general intangible cultural heritage, does not lose its relevance, but is refined over time. While in the past the main recording tool was sketching, due to technical progress photo and video as well as audio recordings became the important means of material recording. Turning to the study of the West Paliessie culture, it should be noted that the interest in the culture of this ethnographic region began quite early. A special mention should be made of the contribution to the preservation of the local cultural heritage by Y. N. Drazdovich and his sketchings, such as "A Belarusian from Paliessie", "A woman in Paliessian costume", "Paliessian house", "Haystacks in Dubranavichy village of Pinsk region"; D. T. Palantkevich, G. Paddebski and other amateur photographers of the early 20th century; Z. Y. Mazhejka and her

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ethnographic film “Paliessian caroling”. Over time, these works do not lose their relevance, and serve as the basis for modern researchers; they give the opportunity to reveal the transformation of local cultural features.

**Key words:** cultural anthropology, visual anthropology, audiovisual folklore studies, West Paliessie, caroling rituals, ethnographic film, video recording.

Каб больш грунтоўна паглыбіцца ў дадзеную тэму, трэба даць вызначэнні наступных паняццяў: антрапалогія – навука аб паходжанні, эвалюцыі і заканамернасцях змен фізічнага складу чалавека [4, с. 552]; культурная антрапалогія – навука аб культуры ва ўсіх формах яе праявы і на ўсіх гістарычных этапах яе развіцця. Пры гэтым культура разумеецца ў шырокім сэнсе як сукупнасць матэрыяльных аб’ектаў, ідэй, каштоўнасцей, уяўленняў і мадэляў паводзін [6]; візуальная антрапалогія – вобласць культурнай антрапалогіі, якая займаецца вывучэннем візуальных рэпрэзентацый, такіх як рытуалы, цырымоніі, малюнкі, фатаграфіі, фільмы і інш. [8, с. 46–47].

Актуальнасць вывучэння сродкаў і метадаў візуальнай антрапалогіі складаецца ў тым, што візуальная антрапалогія ў наш час у Беларусі знаходзіцца ў стадыі развіцця. З кожным годам па дадзенай тэме выходзіць усё больш кніг і артыкулаў, на ўніверсітэцкіх кафедрах уводзяцца адпаведныя курсы, праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі. Выкарыстанне сродкаў і метадаў візуальнай антрапалогіі пры вывучэнні заходнепалескай каляднай абраднасці, як і ўвогуле нематэрыяльнай культурнай спадчыны, не губляе сваёй актуальнасці, а з цягам часу толькі ўдасканальваецца новымі сродкамі. Так, калі раней асноўным сродкам была замалёўка, як у выпадку з першымі спробамі прымянення візуальных метадаў даследавання пры вывучэнні «прымітыўных» народаў [10, с. 7], то пазней дадалася графіка (з першай паловы XIX ст. літаграфія вядома на тэрыторыі Беларусі [5]), а з тэхнічным прагрэсам важнымі сродкамі фіксацыі сталі з’яўляцца фота-, відэа- і аўдыязапісы.

Візуальная антрапалогія і адпаведны ёй аўдыявізуальны метад даследавання дапамагаюць фіксаваць інфармацыю. Асноўная мэта палявой працы, па Б. Маліноўскаму, «улавіць

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

пункт гледжання мясцовага жыхара, усвядоміць яго бачанне яго свету» [7]. Гэтыя словы да нашага часу застаюцца лозунгам культурнай антрапалогіі.

Культурныя каштоўнасці, сялянскі побыт, традыцыйныя строі Заходняга Палесся сустракаюцца ў дакументальных замалёўках. Малюнак Х. Скірмунт 1855 г. «Сялянкі з ваколіц Давыд-Гарадка» захоўваецца да нашых дзён у музеі Беларускага Палесся ў Пінску [2, с. 98]. Вялікую навуковую цікавасць уяўляюць замалёўкі Я. Н. Драздовіча. Так, значная колькасць з іх датуецца 1926–1927 гг. Вялікую культурную і гістарычную каштоўнасць маюць замалёўкі «Беларус-паляшук» (1926) [9], «Кабета ў палескім строі» (1926) [9], праз якія сучасныя этнографы, культуролагі, фалькларысты маюць магчымасць даведацца аб бытаванні мясцовых традыцыйных строяў не толькі на пачатку ХХ ст., але і на працягу ўсяго ХІХ ст. Яшчэ хочацца асобна выдзяліць замалёўкі традыцыйнага жылля палешукоў у творчасці Я. Н. Драздовіча. Вельмі яскрава перадае сялянскую забудову ХХ ст. замалёўка «Палеская хата» (1927) [9], а краявіды Піншчыны зафіксаваны ў замалёўцы «Стажкі ў вёсцы Дубранавічы на Піншчыне» (1927) [9].

Сярод графічных прац ХІХ ст. неабходна выдзяліць выяву жанчыны з Давыд-Гарадка ў традыцыйным мясцовым галаўным уборы «галавачка» [2, с. 97].

Метады візуальнай антрапалогіі ўключаюць фотаэлікацыю. Так, архітэктура заходнепалескіх вёсак мінулага стагоддзя была зафіксавана і ў фотаздымках. Неабходна выдзяліць фатографа-аматара Д. Т. Паланткевіча, які ў 1907 г. быў студэнтам Вышэйшай лясной школы, у пазнейшыя гады – леснікам на Люблiншчыне, аднак аб яго кваліфікацыі як фатографа яскрава сведчыць той факт, што 9 яго фотаздымкаў увайшлі ў даведнік па Галіцыі Мечыслава Арловіча [3, с. 167]. Так, Д. Т. Паланткевіч на Палессі каля 1909 г. зафіксаваў на фотаздымку «Могілкі са старымі мураванымі магіламі» [3, с. 90–91].

Дастаткова вялікая колькасць фотаздымкаў, у тым ліку і заходнепалескіх, пачатку ХХ ст. прыналежыць Г. Паддэбскаму (1890–1945). Г. Паддэбскі – польскі фатограф, уладальнік фотакрамы ў Варшаве, фатограф-самавучка, які потым стаў выдатным прафесіяналам, цікавіўся турызмам і праводзіў сістэматычную кампанію па зборы фотадакументацыі асобных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раёнаў краіны і арганізоўваў з гэтай мэтай экспедыцыі. Фотаздымкі Паддэбскага былі вядомыя па ўсёй Польшчы сваімі рэпрадукцыямі ў розных тыпах альбомаў, даведнікаў, ілюстраваных кніг, плакатаў, паштовак і г. д. [3, с. 166]. Так, каля 1936 г. Г. Паддэбскі на Піншчыне зафіксаваў на фота «Могілкі, 2 розныя кадры» [3, с. 37].



*Мал.* Мяшчанка з Давыд-Гарадка

Вельмі яскрава на фотаздымках Г. Паддэбскага зафіксаваны Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці. Так, вялікую каштоўнасць у плане захавання культурнай спадчыны ўяўляе фотаздымак «Капліца св. Анджэя Баболі на Рынкавай плошчы» [3, с. 40]. На заднім плане – будынак з падвоенымі вузкімі вокнамі і аднапавярховы жылы дом. Фотаздымак датуецца першай трэццю XX ст. Яшчэ адным фотаздымкам, які ўяўляе гісторыка-культурную каштоўнасць Іванаўскага раёна першай трэці XX ст., з’яўляецца «Крыж на месцы мучаніцкай смерці св. Анджэя Баболі» [3, с. 41].

Вяртаючыся менавіта да заходнепалескай каляднай абраднасці, трэба адзначыць, што найбольш поўна яна была зафікса-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вана і папулярызавана ў этнаграфічным фільме «Палескія калядкі» («Беларусьфільм», творчае аб’яднанне «Летапіс», 1972 г.), над якім працавала З. Я. Мажэйка. У фільме адлюстраваны як заходнепалескія калядныя абрады, так і ўсходнепалескія. Разглядаючы менавіта калядныя абрады Брэсцкай вобласці, трэба адзначыць, што ў этнаграфічным фільме зафіксаваны калядкі Пінскага раёна – в. Клятная, Іванаўскага раёна – в. Моталь і аг. Тышкавічы. Дадзены фільм каштоўны тым, што праз яго фалькларысты, этнографы, культуролагі, этнамузыколагі маюць магчымасць пачуць аўтэнтычныя спевы з захаваннем мясцовых асаблівасцей выканання, дыялектныя асаблівасці і пабачыць уласцівыя адметнасці каляднай абраднасці, якая захавалася ў ХХ ст. у бытаванні.

Як вядома, культура – гэта жывая з’ява. Каляндарна-абрадавы фальклор найбольш устойлівы і нязменны, але з цягам часу, тым не менш, перажывае трансфармацыю. У сувязі з гэтым узрастае актуальнасць выкарыстання аўдыявізуальнай фалькларыстыкі.

Аўдыявізуальная фалькларыстыка – субдысцыпліна фалькларыстыкі, якая займаецца метадалогіяй відэафіксацыі фальклорнага матэрыялу, яго аналізам з дапамогай спецыялізаваных сродкаў, у тым ліку праграмных, і яго публікацыяй [1].

Правядзенне фальклорных экспедыцый на Заходнім Палессі з мэтай фіксацыі лакальных версій калядных абрадаў у ХХІ ст. вельмі актуальна, бо ў дадзеным этнаграфічным рэгіёне існуюць калядныя абрады як жывая з’ява сучаснай культуры, функцыянуюць у выглядзе лакальных фальклорна-этнаграфічных комплексаў. Гэта дае магчымасць даследчыкам пры дапамозе параўнальна-гістарычнага метаду даследавання прасачыць трансфармацыю каляднага абраду ў часе, выявіць устойлівасць формы і зместу абраду.

Падводзячы высновы, трэба адзначыць, што сродкі візуальнай антрапалогіі ўдасканальваюцца з цягам часу. Культура Заходняга Палесся зафіксавана ў замалёўках, гравюрах і фотаздымках сусветна вядомых даследчыкаў і аматараў. Метады візуальнай антрапалогіі ў сучасных даследаваннях заходнепалескай каляднай абраднасці не губляюць сваю актуальнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Аудиовизуальные исследования фольклора [Электронный ресурс] / В. Л. Кляус [и др.] // Новые российские гуманитарные исследования. – Режим доступа: http://nrgumis.ru/articles/2048/. – Дата доступа: 16.12.2020.

*2. Винникова, М. Н.* О реконструкции смыслового значения и способов ношения женских головных уборов Туровщины (по материалам белорусской коллекции МАЭ) / М. Н. Винникова // Культурное наследие народов Европы. – 2011. – С. 308

*3.* Katalog fotografii krajoznawczych ze zbioru Mieczyslawa Orlowicza : Kresy / oprac., wstep J. Ihnatowiczowa. – Warszawa : Bibl. Nar., 2000. – 192 s.

*4. Калечыц, А. Г.* Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе / А. Г. Калечыц. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 584 с.

*5. Лазука, Б. А.* Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва : дапаможнік для вучняў / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2001. – 158 с.

*6. Терешкович, П. В.* Антропология культурная [Электронный ресурс] / П. В. Терешкович // Filosofiya.su. – Режим доступа: https://web.archive.org/web/20100127173918/http://www.filosofiya.su/word/antropologiia_kyltyrnaia.htm. – Дата доступа: 29.05.2022.

*7. Христофорова, О. Б.* Полевые методы в визуальной антропологии [Электронный ресурс] / О. Б. Христофорова // Фольклор и постфольклор: структура, типология, семиотика. – Режим доступа: https://www.ruthenia.ru/folklore/hristoforova3.htm. – Дата доступа: 13.05.22.

*8. Чубарьян, А. О.* Теория и методология исторической науки : терминолог. словарь / А. О. Чубарьян. – М. : Аквилон, 2014. – 576 с.

*9.* Этнаграфія: Язэп Драздовіч. Галерэя выяўленчага мастацтва [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://drazdovich.by/gallery/11/full. – Дата доступу: 30.05.2022.

*10. Ярская-Смирнова, Е. Р.* Визуальная антропология: новые взгляды на социальную реальность / Е. Р. Ярская-Смирнова. – Саратов : Научная книга, 2007. – 528 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ